


# Каханне зямное і нябеснае





Паводле сюжэта мюзікла-прытчы «Як ноч стала дзяўчынай» багі Дзень (Кірыл Кучынскі) і Ноч (Інга Кісялёва), Вечнасць (Вольга Калеснікава) ды Імгненне (Мікіта Касцюкевіч) сустрэліся і пачалі размову пра чалавека. Бездапаможным і слабым падаўся ён ім. Але Дзень захапіўся пачуццямі людзей, бо каханне іх магутнае.

Ноч не паверыла гэтаму і вырашыла стаць дзяўчынай, каб спазнаць каханне. Убачыўшы прыгожага хлопца (Уладзіслаў Сазонаў), які танцаваў з маладой дзяўчынай (Паліна Арцюкоўская), Ноч прыцягнула ўвагу юнака і ўкрала ў дзяўчыны. Але прымусіць кахаць немагчыма. Гэта не хоча разумець Ноч, як і тое, што шчасце не спазнаць без болю.

«Ноч не памятае, што каханай ніколі сама не была», — гучыць у мюзікле-прытчы ў моцным рокавым абрамленні. Ноч у выкананні Інгі Кісялёвай прывабная і ў сваіх моцных пачуццях, і ў нянавісці, калі дзеля помсты яна насылае на людзей маланкі і дажджы.

Складаныя вакальныя партыі дэманструюць прыгажосць напісаных кампазітарам Аляксандрам Сухаравым мелодый. Асабліва прыцягальна гучыць голас Вольгі Калеснікавай. Песні напісаны рэжысёрам-пастаноўшчыкам спектакля Уладзіславай Арцюкоўскай. Меладычнасць беларускай мовы дапамагае стварыць неверагоднае музычнае рашэнне мюзікла, сінтэзуючы фолк-мадэрн і рок.

**Глядзіце мюзікл-прытчу «Як ноч стала дзяўчынай» у Маладзёжным тэатры эстрады 8 лютага.**

Арыгінальныя дэкарацыі адлюстроўваюць святло, а белая вопратка герояў дазваляе ім быць своеасаблівым экранам для відэапраекцыі.

Трэба адзначыць таксама прыгожую харэаграфічную пастаноўку балета ( галоўны харэограф — Таццяна Трафімава) і яе выдатнае ўвасабленне на сцэне танцавальным праектам Fusion Маладзёжнага тэатра эстрады. Гледачы нібы апынаюцца ў дзіўнай гісторыі, у якой сон і ява пераплятаюцца.

Мюзікл сцвярджае: каханне — асноўны сэнс жыцця, дзякуючы яму працягваецца чалавечы род на Зямлі.

**Наталля ПАХАМОВІЧ**
**Фота Паула РУСАКА**